Дадатак 1
да загада галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта
ад 21.03. 2022 г. № 47

**Палажэнне**
аб правядзенні XI Абласнога свята духавых аркестраў "Фанфары Гомельщины"

**1. Мэты абласнога свята.**

XI Абласное свята духавых аркестраў "Фанфары Гомельщины" (далей – абласное свята) заклікана садзейнічаць:

прапагандзе і папулярызацыі духавой музыкі;

актывізацыі творчай дзейнасці самадзейных духавых аркестраў;

павышэнню мастацкага ўзроўню.

**2. Кіраўніцтва абласным святам.**

Для падрыхтоўкі і правядзення абласнога свята ствараецца абласны арганізацыйны камітэт, у склад якога ўваходзяць прадстаўнікі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама, установы "Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці", аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Добрушскага райвыканкама.

У перыяд падрыхтоўкі абласнога свята арганізацыйны камітэт далучае сродкі масавай інфармацыі да асвятлення ходу свята, дапамагае ў яго правядзенні, ажыццяўляе непасрэднае кіраўніцтва абласным святам у тэрмін правядзення мерапрыемства.

**3. Умовы і парадак правядзення абласнога свята.**

Абласное свята праводзіцца ў верасні 2022 года ў г. Добрушы ў межах мерапрыемстваў, прысвечаных Дню беларускага пісьменства.

Падчас абласнога свята адбудзецца конкурс духавых аркестраў з найменнем "народны" ("узорны") незалежна ад ведамаснай прыналежнасці.

Калектывы УА "Гомельскі дзяржаўны каледж мастацтваў імя Н.Ф.Сакалоўскага", УА "Мазырскі дзяржаўны музычны каледж" не прымаюць удзел у конкурсе, але маюць права прыняць удзел у святочным шэсце.

**Патрабаванні да праграмы для ўдзелу ў святочным шэсці.**

Кожны духавы калектыў з найменнем "народны" ("узорны"), незалежна ад ведамаснай прыналежнасці, павінны выканаць 1 твор для

ўдзелу ў святочным шэсці. Твор можа быць з конкурснай праграмы, але не будзе ацэньвацца журы абласнога свята падчас удзелу ў святочным шэсці. Удзельнікі калектыву павінны мець канцэртны выгляд.

**Патрабаванні да конкурснай праграмы.**

Праграма аркестраў складаецца з 2-х рознахарактарных твораў агульнай працягласцю да 10 хвілін.

Аркестрам дазваляецца выкарыстоўваць толькі адзін мікрафон для саліста.

Заяўкі на ўдзел у абласным свяце (разам з фотаздымкам у фармаце jpeg або jpg не менш 800x600 пікселяў) дасылаюцца да **5 жніўня 2022 года** на электронны адрас: ocnt6@mail.gomel.by, установа “Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці”, аддзел аматарскай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці (форма заяўкі дадаецца).

На афіцыйным сайце ўстановы “Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці” да 26 жніўня 2022 года будзе размешчаны спіс удзельнікаў абласнога свята.

**4. Конкурсные выступленні праводзяцца па наступных намінацыях:**

аркестр духавых інструментаў з найменнем “народны”;

аркестр духавых інструментаў з найменнем “узорны” (дазваляецца да 20% ілюстратараў ад усяго складу).

**5. Падвядзенне вынікаў конкурса і ўзнагароджванне.**

Падвядзенне вынікаў членамі журы адбудзецца ў дзень прагляду праграм.

Крытэрыі ацэнкі:

складанасць рэпертуару, узровень выканаўчага майстэрства;

раскрыццё музычна-вобразнага зместу твораў;

тэхнічныя здольнасці выканання і культура гуказдабыцця;

ансамблевы строй;

касцюміраванне, сцэнічная культура.

Журы будзе ўлічваць выкананне ўмоў конкурса.

Па выніках конкурсных выступленняў журы вызначае лаўрэата з уручэннем Гран-пры, дыплома і каштоўнага падарунка на суму ў памеры да 8 базавых велічынь; дыпламантаў I, II, III ступеняў у кожнай намінацыі з уручэннем дыплома і каштоўнага падарунка: I ступені – на суму ў памеры да 6 базавых велічынь; II ступені – на суму ў памеры да 4 базавых велічынь; III ступені – на суму ў памеры да 3 базавых велічынь.

Калектывы, не стаўшыя пераможцамі, але паказаўшыя добры выканаўчы ўзровень, узнагароджваюцца граматамі за ўдзел у абласным свяце.

Арганізацыйны камітэт абласнога свята прадугледжвае ўзнагароджванне дыпломамі і каштоўнымі падарункамі на суму ў памеры да 2 базавых велічынь у дадатковых намінацыях:

лепшаму салісту-інструменталісту;

за складанасць рэпертуару.

Пры неабходнасці журы мае права прысудзіць не ўсе дыпломы, змяніць дадатковыя намінацыі або ўвесці новыя. Рашэнне журы канчатковае і перагляду не падлягае. Ацэначныя балы, паводле пратаколаў, не выносяцца на ўсеагульнае абмеркаванне. У выпадку непрысуджэння, падзелу месцаў паміж удзельнікамі дапускаецца падзел каштоўных падарункаў у межах прадугледжаных сродкамі абласнога бюджэту.

Вынікі абласнога свята размяшчаюцца на сайце ўстановы “Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці”.

**6. Фінансаванне.**

Фінансавыя выдаткі па арганізацыі і правядзенню абласнога свята ажыццяўляюцца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных установе “Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці” на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў у рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы “Культура Беларусі” на 2021-2025 гг.

**7. Транспартныя і камандзіровачныя выдаткі.**

Транспартныя і камандзіровачныя выдаткі калектываў-удзельнікаў абласнога свята ажыццяўляюцца за кошт накіроўваючага боку.

**8. Кантакты.**

Адрас: 246022, г. Гомель, вул. Кірава, 49, установа “Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці”.

Кантакты для вырашэння арганізацыйных пытанняў: 33-71-63, +375(29)195-03-49, Паўловіч Карына Андрэеўна – метадыст па музычна-інструментальнаму мастацтву ўстановы “Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці”.